**Гісторыка-літаратурная паралель**
**“Званы памяці…”**

**Намінацыя “Гістарычны хранограф”**

Служэнка Алена Уладзіміраўна,
настаўнік пачатковых класаў (для вучняў 4-7 класаў).

**МЭТА:** выхаванне пачуцця патрыятызму ў вучняў; ушанаванне памяці загінуўшых у гады вайны.

**ЗАДАЧЫ:** выхоўваць любоў да Радзімы, гонар за тых, хто яе абараняў у гады Вялікай Айчыннай вайны; пазнаёміць з гісторыяй Петрыкаўшчыны ў гады вайны; расказаць пра ахвяр генацыду на беларускай зямлі.

*Эпіграфы:*

1. Я чую голас несціханы –
   Зямля мая мяне заве
   І кроіць сэрца мне на раны,
   Звініць, як звон касы ў траве…                Я. Колас.
2. Ім не спявалі маткі калыханкі,
   Яны не чулі казак ад дзядоў,
   Палохаў іх ахрыпшы голас танкаў,
   Трывожыў іх журботны енк удоў…       П. Панчанка.

*(Мерапрыемства можна весці аднаму настаўніку, можна разбіць інфармацыю паміж вучнямі і інш. Варыянты правядзення настаўнік выбірае самастойна, зыходзячы з прапанаванай інфармацыі).*

- Наша мерапрыемства сёння называецца гісторыка-літаратурная паралель “Званы памяці”. Чаму так называецца? Таму што мы будзем звяртацца як да гісторыі, так і да літаратуры, якая цесна з ёй звязана.

Сёння мы ўспомнім адну з самых цяжкіх старонак у жыцці беларускага народа – Вялікую Айчынную вайну, якая забрала больш за 20 млн. жыццяў беларусаў.

Часцей, часцей прыпамінай
Імёны паўшых смерцю храбрых
За родны край, наш мілы край, -
Каб над зямлёй, што млела ў ранах,
Плыў гэты сіні-сіні ранак,

Цвіў гэты белы-белы май, -
Часцей, мой друг, прыпамінай!
Прыпамінай часцей, мой друг,
Імёны тых, што усё зрабілі, -
Вышэй усіх тваіх заслуг,
Што, як і ты, да слёз любілі
Маністы ўвосень на рабіне
І ў росных смолках майскі луг, -
Не забывай пра іх, мой друг!... Н. Гілевіч.

- Усё далей адыходзяць у мінулае гады Вялікай Айчыннай вайны, у выніку якой нямецка-фашысцкія войскі былі разбіты і гітлераўская Германія капітулявала. Шмат змянілася на зямлі з той пары. На месцах руін выраслі новыя гарады і вёскі. Выраслі новыя пакаленні людзей, не ведаючых жахаў вайны. Час даўно пабяліў галовы ветэранаў. Многіх з іх ужо няма ў жывых. Аднак час не можа выкрасліць з памяці народнай імёны і подзвігі людзей. Усе, хто застаўся ў жывых, памятаюць гады ваеннага ліхалецця, баі і бітвы, ярасныя атакі і дарогі, па якіх яны прайшлі.
- Гісторыя не ведала такіх бед і пакут, якія выпалі на долю людзей таго часу. Страшна падумаць. У Беларусі загінуў кожны чацвёрты, а то і трэці… У час вайны на тэрыторыі Беларусі было створана фашыстамі 250 лагераў смерці. У Мінску і каля яго такіх лагераў было 5. Адзін з іх – Трасцянец (за 10 км на ўсход ад горада). Па ўмовах здзекаў з людзей ён стаяў на трэцім месцы пасля Асвенцыма і Майданэка. Там знішчана 206500 чалавек.
- 22 сакавіка 1943 г. спалена вёска Хатынь (149 чалавек, 75 дзяцей). Разам з жыхарамі спалена 628 вёсак, з якіх 188 так і не адноўлена пасля вайны. З Беларусі было вывезена 400 тысяч чалавек (24 тысячы дзяцей). З іх дадому вярнулася толькі 120 тысяч. З ворагам змагаліся 1 млн.300 тысяч беларусаў.
- Не ведала гісторыя і такога масавага гераізму, які праявілі байцы і партызаны на франтах і ў тыле акупантаў. Тры доўгія гады тапталі гітлераўцы беларускую зямлю. Яны спусташалі гарады Беларусі, разбуралі фабрыкі і заводы. У вёсках захопнікі спалілі 1 млн. 200 тысяч будынкаў, ператварылі ў руіны каля 7 тысяч школ, амаль усе бальніцы, тэатры, клубы, музеі. У Мінскім гета забілі звыш 90000 яўрэяў. Людзей марылі голадам, цкавалі аўчаркамі, расстрэльвалі, вешалі, палілі жывымі, тапілі ў рэках, жывымі зарывалі ў супрацьтанкавых равах і ярах.
- Як вы думаеце, ці былі зверствы акупантаў стыхійнымі? (Не).
- Чаму? Якія планы былі ў гітлераўцаў?

(Нямецка-фашысцкія захопнікі раней распрацавалі жудасныя планы знішчэння народа. Яшчэ ў маі 1940 г. кіраўніцтва Германіі прыняла дырэктыву пра распрацоўку плана “Ост” – плана знішчэння народаў Усходняй Еўропы. Планам прадугледжвалася ліквідаваць Савецкі Саюз. Тэрыторыю Беларусі меркавалі засяліць немцамі і пасля каланізацыі ўключыць у склад Германіі. Гітлераўцы выявілі намер выселіць у Заходнюю Сібір тры чвэрці жыхароў Беларусі, а астатніх знішчыць ці анямечыць,ператварыць у рабоў).

- Скажыце, калі ласка, ці ведаеце вы, хто першым прыняў бой, калі пачалася вайна? (Героі Брэсцкай крэпасці).
- Былі знойдзены надпісы на сценах Брэсцкай крэпасці: “Нас было пятеро: Седов, Грутов И., Боголюб, Михайлов, Селиванов В. Мы приняли первый бой 22.06.1941. Умрём но из крепости не уйдем!”.

“Я умираю, но не сдаюсь! Прощай Родина. 20.07-41г.” *(фотаздымкі).*

- Нягледзячы на раптоўнасць нападу, гітлераўцам не ўдалося ўзяць крэпасць штурмам. Абаронцы крэпасці адбівалі ўсе атакі гітлераўскіх войск. 27 чэрвеня германскія танкі ўвайшлі ў Мінск, 16 ліпеня – у г. Смаленск, а Брэсцкая крэпасць стаяла непрыступным бастыёнам у глыбокім тыле фашысцкіх армій, адрэзаная ад усяго свету (рацыя сапсавалася ў першыя ж дні). Не было вады, заканчваліся запасы ежы, але ж абаронцы і не думалі здавацца. Стойкасцю і мужнасцю людзей былі здзіўлены нават ворагі, якія перад гэтым пераможна прайшлі амаль усю Еўропу. У нямецкім архіве быў знойдзены баявы данос: “Ошеломляющее наступление на крепость, в которой сидит отважный защитник, стоит много крови. Эта простая истина еще раз доказана при взятии Брестской крепости. Русские в Брест-Литовске дрались исключительно настойчиво и упорно, они показали превосходную волю к сопротивлению и замечательную выучку пехоты”.
- Большасць мужных абаронцаў Брэсцкай крэпасці геройскі загінула. Апошні бой прыняў цяжка хворы камандзір палка П.М. Гаўрылаў. Аглушаны і паранены, ён трапіў у рукі фашыстаў. Яго паказвалі нямецкім афіцэрам як чалавека незвычайнай стойкасці і волі да перамогі. У 1965 г. Брэсцкай крэпасці прысвоена званне “Крэпасць-герой”.

Когда наклоняется знамя
Над павшими в грозном бою,
Роняет печальное солнце
Слезу вековую свою.

На свежем высоком кургане
У чёрной могильной плиты
В глубоком и скорбном молчанье
Встают на колени цветы,

А ветер, летящий над чашей,
Разносит над ширью земной
Наш залп, на кургане гремящий
Как клятва Отчизне родной …

Но снова взвивается знамя,
И трубы оркестров гремят,
И пушки стальными стволами
Вбивают снаряды в закат,

И ветер, свистящий над чашей,
Разносит грозней, чем вчера,
На запад, как буря, летящий
Ракат громового “Ура”. А. Безыменский.

- Вайна грымела недзе далёка на захадзе, але трывога адчувалася і тут, у пакуль яшчэ далёкім тыле. Што ж адбывалася на Петрыкаўшчыне?
- Ужо ў панядзелак 23 чэрвеня 1941 года пачалася мабілізацыя. Каля ваенкаматаў у Петрыкаве і ў Капаткевічах ігралі гармонікі, плакалі і смяяліся людзі, адпраўляліся да чыгункі ў Муляраўцы каманды. Ніхто не ведаў, не мог здагадацца і прадбачыць, якія выпрабаванні чакаюць усіх у бліжэйшы час. Двор сярэдняй школы ў Петрыкаве быў перапоўнены мабілізаванымі, вакол таўпіліся бацькі, родныя, знаёмыя. 24 чэрвеня ў Петрыкаве праходзіла нарада раённага актыву. У зале Дома культуры выступаў дзед Талаш, які звяртаўся да прысутных на сваёй паляшуцкай мове, часам узмахваў рукой. Здавалася, вось сыйдзе дзед са сцэны і павядзе ўсіх за сабою, як у грамадзянскую вайну.
- 22 ліпеня ў 18 гадзін фашысты рушылі ў атаку з боку Брынёва. Тры разы яны хадзілі ў атаку і кожны раз пад шквальным агнём вымушаны былі адступаць. Але ж 27 ліпеня ў 7 гадзін немцы пачалі абстрэльваць горад з мінамётаў. Баі ішлі ў самім Петрыкаве і ў прыгарадзе на працягу двух дзён. 29 ліпеня савецкія войскі вымушаны былі пакінуць Петрыкаў. У сярэдзіне жніўня 1941 г. тэрыторыя Петрыкаўскага і Капаткевіцкага раёнаў – апошніх на Беларусі – поўнасцю была акупіравана фашысцкімі войскамі.

- Уся гісторыя вайны складаецца з герояў, якіх мы і не ведаем, кожны з іх унёс свой уклад у вызваленне Беларусі. Пры ўдзеле ў баях за Петрыкаў таксама загінула шмат герояў. Адзін з іх – гэта пагранічнік капітан Ёлкін. У ліпені 1941 года праз Петрыкаў ішлі пагранічнікі, яны прынялі ўдзел у баях за горад. На некаторы час горад удалося адбіць у фашыстаў з дапамогай гэтых пагранічнікаў. Шлях наступаючым быў адкрыты цаной жыцця героя, ён, паранены, забіў кулямётчыка.

Шмат матуль у той час не дачакалася сыноў дадому:

Не дачакаўшыся сыноў адтуль –
З вайны вялікай, прорвы апраметнай,
Сышлі ў магілу тысячы матуль –
Марыль, Прасак, Кацярын, Настуль –
Сышлі звычайна, ціха, непрыкметна,
Як і жылі пад зоркай пракаветнай …
Што ў міг апошні думалі яны?
Што іх дзяцей не будзе ля труны.      Н. Гілевіч.

- На захопленай тэрыторыі гітлераўцы адразу пачалі ствараць свой "новы" парадак. Беларусь, якую немцы называлі "генерал-бецырк Беларутэнія", распаласавалі на кускі. Насельніцтва паўсюдна аказвала супраціўленне новым парадкам (карціна "Партызаны").
- Каго нагадвае гэты малюнак?
- 60% тэрыторыі кантралявалі партызаны. Першы партызанскі атрад у Петрыкаве быў створаны ў ліпені 1941 года. Да 1943 года было створана 4 партызанскія брыгады – 130 Петрыкаўская, 120 і 125 Капаткевіцкая і 150 імя Ф.М. Языковіча. *(Фотаздымкі землякоў-партызан)*.
- У красавіку 1942 года ў Петрыкаве створана камсамольска-маладзёжная арганізацыя, якой кіраваў Ф. Кляўцоў. У яе ўваходзілі Сцяпан Грайненка, Лідзія Чарнобылец, Мікалай Каржанеўскі, Іван Сцебуноў, Адольф Уладычанскі, Васіль Чарнобылец, Марыя Петравец, Юрый Бажок. С.Грабіненка прымаў на радыё зводкі Саўінфармбюро, падпольшчыкі распаўсюджвалі сярод насельніцтва лістоўкі. З восені 1942 года падполле было цесна звязана з партызанамі. 29 студзеня 1943 года Л.Чарнобылец узарвала гебісткамісарыят у Петрыкаве.
- Ці ведаеце вы пра ўчынак, падобны на гэты?
- Як звалі жанчыну? (Герой Савецкага Саюза Алена Георгіеўна Мазанік узарвала намесніка Гітлера ў Беларусі гаўляйтэра Вільгельма фон Кубэ).
- Як называецца кніга, у якой апісваюцца гэтыя падзеі? ("Возмездие").

- Чаму гэта кніга так называецца? (Адплата ворагу).
- Ці свядома ішла жанчына на гэта? Якія радкі кнігі аб гэтым сведчаць? (Яна развітвалася з сонейкам).
- Новым этапам партызанскага руху стала рэйкавая вайна. Найбольш бліскучай і складанай партызанскай аперацыяй у 1942 годзе быў падрыў чыгуначнага маста праз раку Пціч, у выніку якога рух па чыгунцы ў час напружаных баёў у Сталінградзе спыніўся на 18 сутак. 7 партызан загінула, 12 было паранена, вораг панёс вялікія страты, захопнікі ў выніку не атрымалі дапамогі, якую чакалі. Многія ўдзельнікі аперацыі былі адзначаны ўрадавымі ўзнагародамі.
- Якія людзі праславіліся на Петрыкаўшчыне ў час вайны?

Цяжка перажыў гэтую навалу на нашу краіну Васіль Ісакавіч Талаш, які дзякуючы Я.Коласу стаў сапраўдным народным героем. Жнівеньскім днём, калі дзед быў дома адзін, наляцелі ворагі на в. Навасёлкі, і адразу да Талаша. Дапытвалі, пагражалі расстрэлам, адабралі ордэн Леніна. Потым забралі ў турму ў Петрыкаў. Яму ўдалося вызваліцца, пасля чаго праз некалькі месяцаў ён падаўся да партызан. Зрабіў гэта, як заўсёды, кемліва. Перад тым як падацца ў лес, узяў сякеру, пайшоў на Прыпяць, высек у лёдзе пельку. Потым склаў каля яе адзенне і, павярнуўшыся, ступаючы ў свае сляды, выйшаў на дарогу. Разнеслася чутка, што дзед не вытрымаў абразы і знявагі ворагаў, утапіўся.

- Успомнім яшчэ пра аднаго чалавека, які змагаўся з ворагам на Петрыкаўшчыне. Гэта Ян Налепка – начальнік штаба 101-га ахоўнага палка акупантаў, які дыслацыраваўся ў Капаткевічах. Стварыў антыфашысцкую арганізацыю, якая наладзіла сувязь з партызанамі, і ў маі 1943 года разам з групай патрыятычна настроеных славакаў перайшоў да партызан. Загінуў 17 лістапада 1943 года. У 1945 годзе яму прысвоена званне Героя Савецкага Саюза пасмяротна.
- Пасля партызанскіх дыверсій улетку 1942 г. немцы вырашылі правесці карную экспедыцыю. Фашысты загадалі славакам 101-га палка, у якім служыў Налепка, акружыць вёску Аголічы і арганізаваць экзекуцыю – расстраляць, спаліць… Ян Налепка выклікаў старасту вёскі Васіля Шлягу, загадаў яму адабраць з ліку жыхароў некалькі старых, найбольш паважаных людзей, і паехаў з імі ў Петрыкаў. Ім удалося даказаць, што жыхары Аголіч да партызанскіх дзеянняў адносін не маюць. Вёска была выратавана. Праз некалькі дзён каля Аголіч пратызаны падарвалі нямецкую машыну. Зноў фашысты арганізавалі карную экспедыцыю. Некаторыя людзі ўцяклі ў лес, астатніх славакі загналі ў хлеў. Налепка рабіў выгляд, што выконвае загад фашыстаў. У адным з дамоў выбілі шыбіны, з некаторых павыносілі

маёмасць. Дзве хаты без жыхароў падпалілі, а людзей адпусцілі. Жыхары вёскі пасля гэтага ўсе да аднаго падаліся ў лес. Фашысты западозрылі Яна Налепку ў сувязі з партызанамі, полк знялі з аховы і замянілі яго нямецкай часцю.

- Яшчэ аднаго героя памятае Петрыкаўшчына. Чалы Мікалай Палікарпавіч, нарадзіўся ў Харкаўскай вобласці, малодшы лейтэнант, камандзір атрада Дняпроўскай ваеннай флатыліі, удзельнік баёў у Вялікай Айчыннай вайне на Беларусі. Камандаваў галаўным атрадам у чатырох дэсантных аперацыях, вызначыўся ў баях за вёскі Конкавічы, Скрыгалаў. Загінуў 01.07.1944 г. каля вёскі Дарашэвічы, там і пахаваны. Яму прысвоена званне Героя Савецкага Саюза. Яго імем названа вуліца ў г.Петрыкаве.
- Вось такіх герояў памятае Петрыкаўшчына.

Беларусь! Пакутніца – матуля,
партызанка, воіна сястра,
не забыла ты, як свішчуць кулі,
як палеткі спелыя гараць.
Не забылі ніцыя бярозы,
як стагнаў пад цяжкім ботам шлях, -
на зямлю раняюць росы-слёзы
па тваіх загінуўшых сынах.
На пагоркі ўсталі абеліскі
вартаваць няскончаныя сны;
у новых хатах – новыя калыскі;
а ў калысках – дочкі і сыны.            Х. Жычка.

- Скажыце, ці толькі дарослыя змагаліся супраць фашыстаў?

Я хачу расказаць вам пра падлеткаў, якія змагаліся за Петрыкаўшчыну, былі ў лагерах і Нямеччыне.

- Саша Глушко перад самай вайной з пахвальным лістом закончыла сямігодку. Наперадзе, здавалася ёй, такое вялікае, цікавае жыццё… (в.Бабунічы)
- Разам з іншымі юнакамі і дзяўчатамі Сашу ўключылі ў спісы рабоў, якіх накіроўвалі на катаржныя работы ў Германію. Па дарозе ўдалося ўцячы. Саша вярнулася ў родную вёску, але дома ёй заставацца было нельга. Шлях ляжаў у партызанскі атрад. Адважную, рашучую дзяўчыну камандаванне ўключала ў склад дыверсійнай падрыўной групы. Аднойчы Сашу параніла, у непрытомным стане яе схапілі ворагі. Доўга дапытвалі 17-гадовую

партызанку. Катавалі, білі. Саша маўчала… Нічога не дабіўшыся, ворагі ноччу вывелі Сашу на расстрэл.

- У далёкім Ціхім акіяне плавае карабель, на высокім борце якога напісана: “Віця Сітніца”. Імя сялянскага хлапчука з вёскі Курыцічы, які ў суровыя гады выпрабаванняў са зброяй у руках стаяў на абароне яе і аддаў сваё маладое жыццё. Віцю было 14 год, калі пачалася вайна. З першых дзён хлапчук трымаў сувязь з партызанамі. Маленькі, непрыкметны з выгляду, ён быў выдатным разведчыкам. А ў ліпені 1942 года разам са старэйшым братам Іванам пайшоў у партызанскі атрад. Не раз прымаў удзел у дыверсійных аперацыях. Быў май 1944 г. Віця па справах пайшоў у в. Курыцічы. Вось і знаёмая вуліца. Раптам хлопец уздрыгнуў ад нечаканасці: зусім блізка стаялі незнаёмыя людзі, з выгляду партызаны. Незнаёмцы таксама заўважылі юнага партызана, накіраваліся да Віці. Гэта былі немцы. Віця адбег убок, зрываючы з пляча аўтамат. Даў доўгую чаргу па ворагах. Некалькі з іх упала, астатнія адкрылі ўслед агонь. Яго паранілі, наваліліся і скруцілі. Віцю прывезлі ў Смятанічы ў камендатуру. Доўга дапытвалі, катавалі. Нічога ад яго не дабіўшыся, гітлераўцы расстралалі Сітніцу. Ён пасмяротна ўзнагароджаны ордэнам.

- Шмат дзяцей і дарослых загінула ў часы вайны, і не толькі на полі бітвы. Паслухайце верш:

*“Асвенцым”*
“Нас тут было чатыры мільёны!” –
Крычыць жахлівы надпіс са сцяны.
“Усім, усім падпальшчыкам вайны
На ўсе вякі мы шлём свае праклёны!

Нас з’еў агонь – чатыры мільёны
Мужчын, жанчын, дарослых і дзяцей.
Скажыце: дымам з вогнішча касцей
Сягоння свет ужо не заімглёны?

Скажыце – мёртвыя, мы хочам знаць:
З жаночых кос як таннай сыравіны
Ужо не ткуць сягоння мешкавіны
І дываноў, каб ногі выціраць?

А каб мільёнамі не паміраць –
Вы знаеце, што вы рабіць павінны? Н. Гілевіч.

- Аб чым гэты верш?
- Што рабілі з людзьмі ў канцлагерах?
- Як адказаць на апошняе пытанне загінуўшых?

(Жыць мірна, усё рабіць для таго, каб не было вайны, быць чалавекам з вялікай літары, выхоўваць у сабе лепшыя якасці чалавечай душы).

- Непадалёку ад п. Капаткевічы нямецка-фашысцкія захопнікі стварылі спецыяльныя лагеры для дзяцей. У жудасных, нечалавечых умовах там утрымліваліся сотні дзяцей. Многія з іх загінулі, частка была вывезена для збору крыві. За калючы дрот у два баракі сагналі больш за 300 дзяцей з Петрыкава і навакольных вёсак. Жудаснае жыццё было ў фашысцкіх засценках. Праз кожныя 2-3 тыдні з дзяцей выкачвалі кроў. Амаль не кармілі. Поліўка з гнілой бруквы ў кансервавай бляшанцы, акрайчык хлеба – увесь паёк на суткі. Толькі перад самай здачай крыві крыху падсілкоўвалі, давалі чай з цукрам. Многія дзеці паміралі, найбольш хлопчыкі. Пасля вызвалення ў былым лагеры для дзяцей знаходзілі пісьмы і запіскі: *“Мама і татачка! Я жыць не буду, бывайце! Надзя…”; “Дарагія бацькі! Нас завезлі за Капаткевічы за калючы дрот. Там такіх дзяцей вельмі многа. Кажуць, нас павязуць у Брэст. Вельмі цяжка падумаць, што я вас больш не ўбачу. Я, відаць, не вытрымаю, я загіну… Цалуйце за мяне ўсіх. Я больш вас не пабачу. Ларыса”.*
- Я хачу пазнаёміць вас з пісьмом 15-гадовай дзяўчынкі Каці Сусанінай, якая была ў рабстве ў германскага памешчыка і, даведзеная да адчаю, пакончыла жыццё самагубствам. Гэта было на Віцебшчыне:

*«Дорогой, добрый папенька!*

*Пишу я тебе письмо из немецкой неволи. Когда ты, папенька, будешь читать это письмо, меня в живых не будет. И моя просьба к тебе, отец: покарай немецких кровопийц. Это завещание твоей умирающей дочери.*

*Несколько слов о матери. Когда вернёшься, маму не ищи. Её расстреляли немцы. Когда допытывались о тебе, офицер бил её плёткой по лицу. Мама не стерпела и гордо сказала, вот её последние слова: «Вы не запугаете меня битьём. Я уверена, что муж вернётся назад и вышвырнет вас, подлых захватчиков, отсюда вон». И офицер выстрелил маме в рот.*

*Папенька, мне сегодня исполнилось 15 лет, и если бы сейчас ты встретил меня, ты не узнал бы свою дочь. Я стала очень худенькая, мои глаза ввалились, косички мне остригли наголо, руки высохли, похожи на грабли. Когда я кашляю, изо рта идёт кровь – у меня отбили лёгкие.*

*А помнишь, папа, два года тому назад, когда мне исполнилось 13 лет? Какие хорошие были мои именины! Ты мне, папа, тогда сказал: «Расти, доченька, на радость большой!». Играл патефон, подруги поздравляли меня с днём*

*рождения, и мы пели нашу любимую пионерскую песню. А теперь, папа, как взгляну на себя в зеркало – платье рваное, в лоскутах, номер на шее, как у преступницы, сама худая, как скелет, - и солёные слёзы текут из глаз. Что толку, что мне исполнилось 15 лет. Я никому не нужна. Здесь многие люди никому не нужны. Бродят голодные, затравленные овчарками. Каждый день их уводят и убивают.*

*Да, папа, я рабыня немецкого барона, работаю у немца Шарлэна прачкой, стираю бельё, мою полы. Работаю очень много, а кушаю два раза в день в корыте с Розой и Кларой – так зовут хозяйских свиней. Так приказал барон: «Русс была и будет свинья» - сказал он. Я очень боюсь Клары. Это большая и жадная свинья. Она мне один раз чуть не откусила палец, когда я из корыта доставала картошку. Живу я в дровяном сарае: в комнату мне входить нельзя. Один раз горничная полька Юзефа дала мне кусочек хлеба, а хозяйка увидела и долго била Юзефу плёткой по голове и спине. Два раза я убегала от хозяев, но меня находил ихний дворник. Тогда сам барон срывал с меня платье и бил ногами. Я теряла сознание. Потом на меня выливали ведро воды и бросали в подвал. Сегодня я узнала новость. Юзефа сказала, что господа уезжают в Германию с большой партией невольников и невольниц с Витебщины. Теперь они берут и меня с собою. Нет, я не поеду в эту трижды всеми проклятую Германию! Я решила лучше умереть на родной сторонушке, чем быть втоптанной в проклятую немецкую землю. Только смерть спасёт меня от жестокого битья. Не хочу больше мучиться рабыней у проклятых, жестоких немцев, не давших мне жить!..*

*Завещаю, папа: отомсти за маму и за меня. Прощай, добрый папенька, ухожу умирать.*

*Твоя дочь* *Катя Сусанина.*

*Моё сердце верит: письмо дойдёт».*

- А зараз я прывяду прыклад з літаратуры. Паслухайце верш Н. Гілевіча, які з’яўляецца аповедам 4-гадовага загінуўшага хлопчыка.

Я чакаў, што мама прыйдзе па мяне,
Нечым цёплым, цёплым-цёплым ахіне,
Бо так холадна, аж зубы ляскацяць,
За дратамі за калючымі стаяць,
Тут, куды прыгналі нас, адных дзяцей,
Пад дажджом наскрозь прамокшых да касцей …
Мама прыйдзе, мама ўпросіць вартавых
Адпусціць мяне дадому, да сваіх,

Павядзе мяне па мосце за раку –
Да бабулі, а бабулечка з гляка
Поўны кубак мне налье малака!
Ды на печ пасадзіць – ножкі пагрэць.
Кот-вуркот са мной захоча дурэць …
Але раніцы не было.
Але сонца ў той дзень для мяне не ўзышло.
Уначы, калі гуртам мы плакалі ціха за дротам, -
Засвяцілі пражэктары раптам,
Наўсцяж адчынілі вароты і спусцілі на нас
Зграю страшных аўчарак вялізных:
Мы не знали, што іх доўгі час не карміілі наўмысна …
Пакрамсаны, паклычаны ікламі, ледзьве жывы,
Я ляжаў і стагнаў на дарозе,
Пакуль не дабіў вартавы …

- Зараз я хачу пазнаёміць вас з кнігай, якая называецца "Ніколі не забудзем…". Работа па складанню гэтай кнігі пачалася адразу пасля вайны. З красавіка 1946 года ў газеце "Піянер Беларусі" быў надрукаваны ліст піянераў 37-й мінскай школы, у якім яны звярнуліся да ўсіх школьнікаў рэспублікі з прапановай напісаць калектыўную кнігу пра ўдзел беларускіх дзяцей у Вялікай Айчыннай вайне. Работнікі рэдакцыі, студэнты часта выязджалі ў камандзіроўкі, каб на месцы пазнаёміцца з юнымі аўтарамі.
- Давайце нагадаем сведчанні дзяцей Петрыкаўшчыны.

*("Разміноўшчыкі", пераказвае вучань).*

*(Малюнак "Крык Хатыні")*

- Як вы думаеце, аб чым сведчыць гэты малюнак?
- Чым з'яўляецца Хатынь?
- Шмат існуе такіх Хатыней на Беларусі. На Петрыкаўшчыне таксама ёсць спаленыя вёскі. Вёска Хвойня, у якой фашысцкія каты знішчылі 3078 жыхароў, спалілі 350 хат, пасля вайны ўзнавілася, адбудавалася, але стала не такой шматлюднай, якой была калісьці. На брацкіх магілках, у якіх пахаваны ахвяры фашызму, устаноўлены абеліскі.
- На ускраіне в. В.Сялюцічы ўзведзены помнік ахвярам фашызму. На гэтым месцы 18 лістапада 1942 года фашысты спалілі жывымі 364 чалавекі. Спалілі вёску. 220 хат было да вайны, уцалела каля 20. Толькі некалькі жыхароў цудам засталіся жывымі.

*("Як палілі Сялюцічы", з кнігі, расказвае вучань).*

- Усяго на тэрыторыі сучаснага Петрыкаўскага раёна расстраляна, павешана, спалена 5406 чалавек, у тым ліку больш за 300 дзяцей. Вывезена ў рабства ў Германію 4132 чалавекі.
- Вось што такое беларускія Хатыні! Гэта тая рэальнасць, практыка, якую фашызм рыхтаваў цэлым краінам і кантынентам, але шырока распачаць паспеў толькі на нашай зямлі.

Ах, жаўрук!
Чаму так недарэчы
Раніцою песню ты пачаў
Над страшэнным болем чалавечым,
Над слязьмі, што тояцца ў вачах.
У Хатыні кроў ад жаху стыне,
Бомкаюць сумотныя званы.
Рэха іх – балючы напамінак
Той далёкай, лютае вайны.        П. Прануза.

- Хоць і з вялікімі стратамі, але ж дачакаліся беларусы перамогі. Каля Петрыкава ішлі зацяжныя баі. У бінокль быў добра бачны горад. Не дыміліся коміны над хатамі, не было відаць людзей. Ноччу ні аднаго агеньчыка. Горад быў ператвораны ў апорны пункт, склепы і першыя паверхі цагляных будынкаў прыстасаваны для агнявых кропак. Полк рыхтаваўся да нападзення. Раптам над галовамі салдат з сухім шоргатам панесліся вогненныя снарады “кацюш”. Над пазіцыямі гітлераўцаў узняліся клубы агню і дыму. Прагучала каманда: “Наперад, у атаку!”. Пранеслася магутнае “ўра!”, полк пайшоў на штурм варожых умацаванняў. Магутнага прарыву воінаў нельга было стрымаць, і хутка вораг пачаў адступаць. Да зыходу 30-га чэрвеня Петрыкаў быў акружаны. Узорнымі і бездакорнымі былі дзеянні брыгады рачных караблёў Дняпроўскай ваеннай флатыліі, якія дапамаглі сухапутным часцям. Ноччу з 30-га чэрвеня на 1-е ліпеня 1944 года часці 55-й дывізіі разам з дэсантам маракоў пры артылерыйскай падтрымцы караблёў флатыліі авалодалі Петрыкавам…